Генадзь Бураўкін

СІНІЯ АРЭЛІ

ВЕРШЫ

Мінск
«Юнацтва»
1987

ББК 84 Бел 7
Б 91

Для старэйшага школьнага ўзросту

Мастак В. П. МАСЦЕРАЎ

БЕЛАРУСІ

У любві да цябе я не раз буду клясціся.
Не таму,
каб ты помніла клятву маю.
Проста, дзе ні пабуду —
у Смаргоні ці ў Клясціцах,
Я ўсё болей цябе пазнаю.

Пазнаю цябе юнаю і старажытнаю,
У сузор'ях агнёў і ў паводках бяроз.
Кожны раз
кожным нервам сваім, кожнай жылкаю
Перажыў я твой мужны і велічны лес.

Колькі вызнаў і вынес ты,
краю мой мілы!..
І сягоння ўспамін твае грудзі пячэ,
Дзе старыя акопы,
як пустыя магілы,
Што сябры закапаць не паспелі яшчэ.

У нябыт
і нядоля і ворагі рынулі...
І цяпер,
прыгажэй, даражэй удвая,
Ты стаіш, Беларусь,
завадская, зубрыная...

Я — пясчынка твая.
Я — крывінка твая.

І ў любві да цябе я не раз буду клясціся.
Не таму,
        каб ты помніла клятву маю.
Проста, дзе ні пабуду —
        у Смаргоні ці ў Клясціцах, —
Я ўсё болей сябе пазнаю.

ПОЛАЦКАЯ БАЛАДА

Я люблю тваю чуйную зімнюю ціш,
Мой абсыпаны зоркамі горад.
Хто сказаў, што ты ноччу маўчыш?
Ты не спіш.
Ты са мною гаворыш.

Толькі ўслухацца лепш у марозны спакой,
Толькі вочы закрыць на хвіліну —
І пачуеш дыханне далёкіх вякоў,
Старадаўнія песні-быліны.

І не проста ўжо рыпнуў запознены крок,
І дымком пацягнула ад фабрык —
Гэта рыпнуў Скарыны друкарскі станок,
Гэта пахне друкарскаю фарбай.

Рукавом выцер потны, задумлівы твар,
Стаў пад лютаўскім ветрам, ля сходак,
З хрустам плечы расправіў стамлёны друкар,
Мой разумны, няўрымслівы продак.

І не дуб недзе крэкнуў, парушыўшы ціш, —
Зарыпелі ўладарна батфорты.
То ад Верхняга замка спяшае сюды ж
Пётра Першы, суровы і горды...

Хто сказаў, што тут ноччу няма ні душы

І ўсё гэта — рамантыка, ўрэшце,
Толькі снег зарыпіць, зазвіняць ледашы
І нікому з магіл не ўваскрэсці?

Не,
прыслухайся лепш:
не ільдзінкі звіняць —
Гэта шаблі аб ківеры звоняць,
Гэта цяжка даецца французам Дзвіна,
Заіржалі трывожныя коні...

І таму я люблю слухаць зорную ціш,
Твае казкі начныя, мой горад...
Хто сказаў, што ты ноччу маўчыш?
Ты не спіш.
Ты са мною гаворыш...

ЛЯ ПАРТЫЗАНСКІХ СЦЯГОЎ

Яны выцвілі ў дыме боек,
Каля зыркіх начных кастроў
І прынеслі ў залу з сабою
Родны пах беларускіх бароў.

Дзе між імі той самы родны,
З пахам хвой і купальскіх траў,
Той, які пад агнём кулямётным
Бацька мой цалаваў?

Можа, гэты, прабіты куляй?
Край яго парудзеў ад крыві.
Да яго працягнуў руку я,
Поўны шчасця, тугі і любві,
Каб узняць яго зноў, як бацька,
Не збаяцца нягоды любой...

Чую раптам:
«Не дакранацца
Да музейнага сцяга рукой!»

Гэта вы, вартаўнік?
Прабачце.
Адшукаў запаветны сцяг.
Гэта пэўна: яго мой бацька
Перад смерцю збярог на грудзях.

Гэта ён тут, паміж сцягамі,
Самы просты з музейных сцягоў.
Калі нельга рукой —
губамі
Мне дазвольце крануцца яго.

ЗАВЯШЧАННЕ

Героям-камсамольцам Обалі

Няма над вашай магілай помніка.
Голы,
Невысокі грудок
ад вятроў і дажджоў парыжэў.
Але мы чуем,
мы чуем ваш голас —
І ён для нас
за ўсе помнікі даражэй.

«Дарагая зямля!
Надыходзіць з табою расстанне.
Ты вельмі прыгожая сёння,
Хоць і дождж асенні імжыць.
Хутка будзе світанне.
Хутка нас на зямлі не стане.
Людзі!
Помніце, людзі, —
Нам вельмі хацелася жыць.

Мы ў сваіх біяграфіях
Не закончылі першай старонкі,
Яна чыстая-чыстая
Перад намі ляжыць...
Нас не будзе.
А на зямлі расцвітуць рамонкі.
Мы любілі рамонкі.
Нам вельмі хацелася жыць.

Калі скажуць,
Што мы баяліся смерці, —
Не верце.
Мы будзем спяваць перад смерцю —
І голас не задрыжыць.
Толькі,
        чуеце, —
Мы завяшчаем
        жыццём і смерцю —
Вы не маеце права
Дрэнна і мала жыць.

Нам жа вельмі хацелася жыць...»

ТАНЦЫ ЛЯ ВАЕНКАМАТА

Танцы ля ваенкамата,
Танцы ля ваенкамата...
Стрыжаныя, у ватоўках хлопцы.
У дзявочых вачах —
        туга.
І маці,
        старыя, прыціхлыя маці:
«Вось і да малодшых дайшла чарга».

А пары кружацца ў вальсе.
Танцы ля ваенкамата.
І ў нязграбных стрыжаных хлопцаў
Бесклапотны настрой...
А потым
        уладна грымне
На гулкім двары каманда
І стройныя сяржанты
Выраўняюць строй.

І будуць хлопцы дагледжаны,
Накормлены і абуты,
І старшыня ім выдасць
Удосталь
махоркі і сноў...

Маці,
        чаго ж вы плачаце,
Чаго глядзіцё са смуткам

На стрыжаных і нязграбных
Малодшых сыноў?..

Сыны вашы хутка вернуцца,
Ім будзе ў арміі добра.
І маці слёзы ўціраюць
Сарамліва шурпатай рукой.
Яны за сыноў спакойныя.
Што зробіш,
          калі падобны
Стрыжаныя, у ватоўках хлопцы
На паўшых сваіх бацькоў...

БЯЗБАЦЬКАВІЧЫ

Рыгору Барадуліну

Сорак пяты.
Незабыўны год сорак пяты...
Маёвыя песні
Пасля шэрых ваенных зім.
О, як мы ляцелі —
Толькі мільгалі пяты —
Насустрач салдатам вусатым,
Насустрач бацькам
          жывым.

Мы нават і спаць не клаліся
Без бацькоўскай пілоткі,
Усе ў медалях блішчастых
Хадзілі ў сяброў ля акна.
Шчаслівыя,
Мы не бачылі,
Што плакалі аднагодкі,
Якіх сурова назвала
Бязбацькавічамі
          вайна.

Яны тады навучыліся
Хаваць мужчынскія слёзы,
Яны тады навучыліся
Матак сваіх берагчы.
Не па гадах маўклівыя,

Зацятыя і сур'ёзныя,
Бацькоў —
У медалях, у ордэнах —
Снілі яны штоначы.

З пасівелымі маткамі поплеч
Працу любую рабілі,
Многія не паспелі
Закончыць дзесяты клас.
Сонца, сівер і слота
Твары ім агрубілі.
Здавалася, што і душы
Агрубіць нялёгкі час.

Яны служылі ў арміі,
Яны спраўлялі вяселлі.
Упарта
Бацькі несустрэтыя
Сніліся зноў і зноў.
Дарагія сябры-бязбацькавічы
Аблыселі і абвуселі.
І мы вучымся ў іх пяшчоце,
Калі няньчаць яны сыноў...

* * *

Калі зямля спакойна засынае
І ў зорак нават сплюшчваюцца вейкі,
Тады здаецца,
што на цэлым свеце
Не спяць адны вартаўнікі.

А інвалідам і тады не спіцца,
Смыляць незарубцованыя раны,
І нудна, аднастайна, раўнадушна
Пратэзы ў цішыні начной рыпяць.

Успыхваюць у цемры папяросы —
І дым,
ад дум салдацкіх пасівелы,
Плыве,
плыве бясконцым Шляхам Млечным
І колькі год
ніяк не растае.

На вуліцу выходзяць інваліды,
Каля прысад пахаладзелых крочаць —
І быццам зноў ваенны вецер вее
І тысяча гаёў пад ім рыпіць.

Яны ідуць
з прыгнутымі плячыма,
Нібы параненых таварышаў выносяць

З цяжкіх сваіх ваенных успамінаў,
З далёкіх акрываўленых гадоў.

Бяссонніцу праносяць інваліды
Па вуліцах дваццатага стагоддзя.
І ў іх вачах гарыць, не патухае
Ці то чырвонае густое сонца,
Ці бітваў незакончаных агонь.

А на зямлі спакой світальны дрэмле,
І ў зорак нават сплюшчваюцца вейкі.
І ўсім здаецца,
          што на цэлым свеце
Не спяць адны вартаўнікі.

* * *

Я з твайго неспакойнага племені,
          Партыя,
Хоць ля сэрца білет твой яшчэ не нашу.
Гэта ты разам з маці дала мне ўпартую
І няўрымслівую душу.

Гэта ты мне адкрыла прасторы шырокія
І ў дарогу ўручыла свой дапытлівы зрок.
І заўсёды
          з тваімі ўладарнымі крокамі
Я знітоўваю кожны свой крок.

З тваім словам,
          з тваёю бацькоўскай парадаю
Мы з'іначым зялёную нашу зямлю.
І калі —
          «Камуністы, наперад!» —
          скамандуюць,
Я таксама наперад ступлю.

Аддаю табе рукі
          і сэрца юначае
І прымаю твой казачны, смелы разгон.
Б'юцца ў жылах маіх —
          кроў гарачая матчына,
Твой кастрычніцкі вечны агонь.

* * *

Мой родны край,
за што цябе, скажы,
Гісторыя так люта шкуматала —
Разворвала ўсіх войнаў рубяжы,
Каціла вал грымотнага метала?
Нібыта ёй карцела дапячы
Тваёй спрадвечнай стойкасці вясковай.
Як пяліся чужацкія ключы
Тваю душу замкнуць абавязкова!

І колькі сквапных прыхапняў паўзло
З агнём, з атрутай, з Богам і без Бога!
Свінцом і здрадай рассявалі зло,
Каб зарасла нянавісцю аблога.
Не шкадавалі толу і брані
На ціхія палеткі і прысады.
Але тваёй славянскай дабрыні
Не затапталі танкі і снарады.

Ты ў свайго лёсу нават не спытаў,
За што прыблуды на табе кішэлі.
І маладой нястрымнасцю атаў
Пазараслі акопы і траншэі.
Узрушанаму людству напаказ
Ты ўзняў не крыўдаў звугленыя раны,
А жыццялюбства вечнага запас,
На дне тваіх крынічак захаваны.

ПОЛАЧЧЫНА

Не шукайце красы за морамі,
Узбярэжжаў з крышталёвымі зорамі,
Прыязджайце да нас на Полаччыну,
Пахадзіце яе прасторамі.

Тут азёры, як неба, сінія,
У чаротах чароды гусіныя,
А на дне Млечным Шляхам свецяцца
Трапяткія гурты язіныя.

Навальніцы грымяць над кручамі,
З гор бягуць ручаі грымучыя,
Тут ля Дрысы сасонкі звонкія,
Над Дзвіною бары нявучыя.

Тут вясёлкай сонца акружана,
Усміхаецца з кожнай лужыны,
Тут на кожнага закаханага
Салаўёў па чатыры тузіны.

Тут дзяўчаты ўсе — чарнабровыя,
На палях ільны двухметровыя...
Тут над кожным курганам і каменем
Ці быліна, ці казка чароўная...

* * *

Я не знаю, удаўся ў каго я такі:
Цягне дзіўная сіла мяне да ракі.

Цэлы дзень у прадоннях крынічных віроў
Бачу гульні язёў, чуйны сон шчупакоў.

Я не знаю, удаўся ў каго я такі:
Цягнуць, нібы магнітам, мяне сасняки.

Я гатоў слухаць там ад зары да зары
Перашэпты вяршалін густых угары,

Слухаць дзятла працоўны паспешлівы стук,
Чуць, як проста з-пад ног сыраежкі растуць.

Я адчуў, што і я не чужы на зямлі,
Што гарацьна далонях маіх мазалі...

Да хмурынак-пярын, у паўдзённы блакіт,
Свае звонкія песні ўзнялі жаўрукі.
Чую: гліцу і мох прабіваюць грыбы...
Каб не быў чалавекам,
я б жаўранкам быў
І спяваў бы нястомней за ўсіх і званчэй,
Каб рабілася людзям ад песні лягчэй,
Каб шпарчэй узнімаліся ўвысь сасняки,
Каб вяліся ў вірлівай рацэ шчупакі...
Я не знаю, удаўся ў каго я такі...

САШКА

Цаліна!..
Пакаленння майго неспакойныя сны,
Пераклічка з гадамі Карчагіна і Кашавога,
Гром аркестра і слёзы ў начной цішыні,
І прамыя шляхі, і крывая дарога...

Часам мамчыны дочкі трывалі і ў дождж
і ў мароз,
А ўцякалі дадому хлапцы
у матроскіх цяльняшках...
Вось туды, у казахскія стэпы, занёс
Лёс таварыша нашага даўняга — Сашку.

Ён па дрэвах не лазіў, не купаўся ў вірах,
дзе самы,
Часта ўвосень хварэў, асцярожны і кволы.
І калі на начлегах аб подзвігах марылі мы,
Дык яго ў хлапечы свой гурт не прымалі
ніколі.
Ён жа ў стэпе з сябрамі выцягваў
на мокрых плячах
Трактары з непралазнай гразі і завалаў
бурана,
У дашчаных вагончыках мёрз па начах
І вясёлыя пісьмы пісаў землякам-палачанам.

Не здымаў ён вясною па сутках з штурвала
рукі

І не ведаў, што недзе над Сожам і Шчарай
Выразалі з газеты ягоны партрэт хлапчукі,
Што гурбой на начлегах аб подзвігах мараць.

* * *

Гэта цяжка, таварыш,
Разам кашу варыць.
З кожным стрэчным не зварыш.
Тут не трэба мудрыць.

Тут такія парадкі,
Што пароўну дзялі
І зацішак палаткі,
І вяндліны скрылі.

Часам компас саб'ецца,
Мы ж асільваем шлях.
Толькі грукаюць сэрцы,
Толькі песня ў зубах.

Без папрокаў і скаргаў
Мы нясём за спіной
Дзесяць знойдзеных скарбаў,
Дзвесце казачных сноў.

І калі ўсё стрываеш,
На вяршыні гары
Вельмі добра, таварыш,
Разам кашу варыць.

РАБОТА

Мастаку Міхасю Савіцкаму

Ці ліпеньскі прыпар, ці слота,
Ці вера ў душы, ці адчай —
Работа, работа, работа
Да цемры і сонца ў вачах.

Аддаць свае сілы дазвання,
Засеяць свой трудны загон —
У гэтым жыцця апраўданне
І самы высокі закон.

А слава...
Калі ёй ахвота,
Хай збоку прысядзе цішком.
Работа,
        работа,
        работа
Да зморы, да стомы цяжкой.
Зямны абавязак зацята
Цягнуць ад цямна да цямна —
За шчасце няўмольная плата,
Адзіная ў свеце цана.

Затое не чар пазалота,
Не зманлівы бляск медаля —
Работа,
        работа,
        работа
Навек застанецца пасля.

СКРЫПКА

Скрыпач яе ўзнімае з футарала,
Як немаўля заспанае з калыскі,
І чуйнымі даверлівымі пальцамі
Пяшчотна гладзіць кожную струну.

А потым беражна,
        нібы руку каханай,
Ён да шчакі яе ласкава туліць
І нерашуча ўскідвае над ёю
Цяжкі наканіфолены смычок.

І вось смычок цалуе ціха струны,
Як быццам праганяе сон апошні
І асцярожна выпытаць спрабуе,
Дзе песня найзванчэйшая ляжыць.

А песня ўсё хаваецца гарэзна,
Смычок яе шукае —
        і злуецца,
І ўжо ў адчаі
        па халодных струнах,
Нібы крылом буслiным,
        гулка б'е.

Вы думаеце,
        скрыпцы не балюча,
Калі скрыпач яе смычком пілуе,
Калі вось-вось, здаецца, разарвуцца

Усе чатыры чуйныя струны?

Вы думаеце, так,
без болю,
песня
Народзіцца ў маленькай, кволай скрыпцы
О, вам тады яшчэ не біў па сэрцы
Смычок турбот бяссонных і трывог...

А скрыпка грае.
І ніхто на свеце
Спыніць не зможа і зламаць не зможа
Над чуйнымі разбуджанымі струнамі
Буслінае імклівае крыло.

Яно
то ўверх рванецца нечакана,
То ўніз сарвецца,
то абвяне раптам
І затрапеча ціха і пакорна
У скрыпача ў бязлітаснай руцэ.

І песня
то ад шчасця захлынецца,
То зойдзецца ў душы схаваным болем,
Такім салодкім і такім нясцерпным,
Аж закіпаюць слёзы на вачах.

* * *

Я часам сам сябе не пазнаю:
Разважлівы, спакойны і цвярозы,
Пра маладосць бясхмарную маю
Усё часцей ка мне прыходзіць роздум.

Я ўсё стражэй да слоў сваіх і рук,
Трывожыць сэрца мне любая дробязь,
Нібы адказнасць я за ўсё бяру,
Што ў цэлым свеце думаюць і робяць.

І з кожным днём вярней мне дружбакі,
І ўсё цвярдзей
любоў,
нянавісць,
вера...
Ці то характар робіцца такі,
Ці гэта сталасць стукаецца ў дзверы...

* * *

Калі часам трохі засумуецца
І адчую на душы тугу,
Я выходжу да людзей на вуліцу,
У натоўпа шматгалосы гул.
Паспяшаю непрыкметна зліцца
Я з табою, гарадскі прыбой,
Каб у шумнай радасці згубіцца
Са сваёй нязначнаю журбой.
І па кроплі, па маленькай частцы
Мне ў душу збалелую ідзе
Нехаванае чужое шчасце
Толькі што спатканых мной людзей.
І яны маю бяду-навалу
Разнясуць, развеюць назаўжды,
Запрашаюць нават запявалам
У свае вясёлыя рады.
Не скруціць ніякай чорнай скрусе
Маладосць крылатую маю.
Я іду з усімі і смяюся,
Я іду з усімі і пяю.
І калі каго бяда агорне,
Трапіцца журботны хтосьці нам,—
Я вазьму ў яго часціну гора,
Частку сваёй радасці — аддам.

ЮНАЦТВА СІНІЯ АРЭЛІ

Юлі

Яны прыглушана рыпелі
Сярод старых кашлатых ліп.
Мы тыя сінія арэлі
Зламаць нікому не далі б.

Над імі гойдаліся далі,
Яны нам казкаю былі —
І ў неба сіняе ўзляталі,
І ледзь краналіся зямлі.

І як бы мы ні пастарэлі,
Няхай і летам і зімой
Юнацтва сінія арэлі
Ляцяць між небам і зямлёй...

КРАЙ МОЙ..

Не залаты зусім,
        не срэбны,
Быў на табе заўсёды ўбор
Звычайны самы,
        самы зрэбны —
Зялёны луг ды сіні бор,
Каля дарогі жыта ў полі,
Вярба старая ля ракі
Ды ў жоўтым восеньскім прыполе
Рабін даспелых аганькі.

Ты не сляпіў вачэй.
        Быў просты
Ва ўсе вякі твой родны ўзор:
Гаеў бялюткая бяроста,
Густы блакіт лясных азёр,
І лён,
        зусім як неба,
        сіні,
І ўсе ў рамонках берагі...
Мой беларускі,
        мой адзіны
Край
        ад калыскі
        дарагі...

НАША ПЕСНЯ

Не была ты ніколі пры знаці,
Не стаяла ў чарзе да стала,
Не прасілася слёзна: «Прызнайце»
Проста з людам тутэйшым жыла.

Лес ягоны цярпліва дзяліла,
Не падсмейвалася з-за вугла,
Галасіла на ранніх магілах,
Гулкі рэй на вяселлях вяла.

Не прымала маны і прынукі,
Не сцірала загару са шчок
І хавала сялянскія рукі
Пад сатканы самой хвартушок.

Засталася спагаднай і годнай,
Разбудзіла маўклівы абшар
Некрыклівая споведзь народа,
Васільковага краю душа.

ВЕЧАР У ВЁСЦЫ

Калі кладзецца між барознамі
Запылены апошні цень,
Цяжкою стомаю і роздумам
Развітваецца з намі дзень.
І перш чым выбрацца дахаты,
Так цягне, збоку ад людзей,
У тумане халаднаватым
Хаця б хвілінку пасядзець.

Адчуць цяпло спатнелай робы
І зразумець у соты раз:
Не толькі мы работу робім,
А і работа робіць нас.
Хоць ныюць жылы, ломіць косці,
Але ў душы зусім няма
Ніякай зайздрасці і злосці,
Бо дзень пражыты нездарма.

Чакае блізка двор зацішны,
Дзе водар мяты і смалы.
І жонка ўжо да весніц выйшла.
І мчыць насустрач сын малы.
І нам, знясіленым і грубым,
Супакаенне дорыць час:
Не толькі мы работу любім,
А і работа любіць нас...

* * *

Час хаду у новы дзень прыспешвае
Успаміны горкія драбніць...
А ўсё роўна помнім сорак першы,
Як і сорак пяты,—
да драбніц.

Не закрыць ні радасцю, ні бытам
Тых, што ўпалі ніцма на лаўжы.
Колькі іх, забітых і забытых,
Пад нагамі нашымі ляжыць!

І з зямлі знявечанай рыўкамі
Лезуць —
            дзе рамонак,
            дзе быльнёг.
То яны
            знямоглымі рукамі
Цягнуцца наверх, да нашых ног.

То яны
            насустрач сонцу рвуцца
З чорнага прадоння небыцця.
І калыша вецер Рэвалюцыі
Аганькі кароткага жыцця...
І што значаць нашы ўсе напасці,
Калі можна ў цішы палявой
На калені перад імі ўпасці
І да іх прыпасці галавой...

КАМІСАРЫ

З гадоў,
калі неба крамсалі
Узнятыя гневам клінкі,
Прыходзяць да нас камісары —
Духоўныя нашы бацькі.

На вуснах іх —
марш недапеты,
Упартыя словы надзей.
І кулямі партбілеты
Прышыты да юных грудзей.

І падалі, і ўваскрасалі,
Сабой засланялі жывых.
Сягоння глядзяць камісары,
Як суддзі, на ўнукаў сваіх.

Мы іх перагналі па ўзросту,
Сягнулі да зорак сівых.
І ўсё ж, як падлеткі, зайздросцім
І лёсу, і пафасу іх.

І марай свяшчэннаю самай
У сэрцах надзея гарыць,
Што нас не ўпікнуць камісары —
Суровыя нашы сябры.

У МАЎЗАЛЕІ

Мне трэба
доўга-доўга раіцца
Пра сотні планаў і падзей...
Ды ў Маўзалеі
не спыняюцца
Плыве,
плыве паток людзей.

І не крыўдую ні на кога я:
Тут кожны,
Як і я,
прынёс
Да Ільіча
на споведзь строгую
Увесь свой чалавечы лёс...

БАЛАДА ПРА МІНЁРАЎ

Васілю Быкаву

Дваццаць гадоў
неадступнаю зданню
Былое трывожыць салдацкія сны...
Штоночы ўстаюць і ідуць на заданне
Хлопцы-мінёры апошняй вайны.

Топчуць боты палын прагорклы
І недаспелыя каласы.
Абнюхваюць кожны грудок і пагорак
Мінашукальнікаў тупыя насы.

Здаецца,
вайна так даўно адгрымела.
Акопы быльнягом зараслі...
А мінёры ходзяць нясмела
Па зямлі.

Мінёры пад ногі глядзяць з апаскаю
Не наступіць бы
праз дваццаць год
На выбух
ці на сябраву каску,
Прабітую навылет.

ПОЎДЗЕНЬ

Я веру поўдню.
Ён не памыляецца,
Бо ён не мае ў сабе
ані
Туманнасці яшчэ санлівай раніцы
І стомленай вячэрняй цішыні.

Я веру поўдню.
Казкі не лапоча ён
І позехам даўгім не крывіць рот,
А моўчкі ўсмак працуе заклапочана
Ды рукавом з ілба ўцірае пот.

Ідзе сваёй прывычнаю дарогаю
І памятае, ведае
адно —
Ужо ў зеніце самым сонца строгае,
І ўсё як ёсць адтуль яму відно.

Я веру поўдню.
Веру,
бо з цвярозасцю,
Са сталасцю
ён дружны недарма.
І ў ім няма вячэрняй асцярожнасці,
І ранішняй туманнасці няма.

Я веру поўдню...

ПАЭМА РАССТАННЯ

Памяці Юрыя Гагарына

I

Раставаў сакавік,
як апошняя снежка.
На асфальт выскоквалі яшчаркі раўчукоў.
І,
нібыта люцікі на заўтрашніх
узмежках,
Зацвіталі вяснушкі на насах хлапчукоў.

Маладая вясна пазвоньвала ўладна
Ключамі сасулек у зацішку стрэх.
Шустрымі апалонікамі кроплі падалі
У пацямнелы наздраваты снег.

Знямоглымі інфарктнікамі няўклюдна
асунуліся
Забытыя снегавікі ў дварах.
Дамы скідалі з уздыхам сумным
Парудзелую аўчыну белых папах.

Сонца ламілася ў вокны гарэзна,
На пятакі «зайчыкаў» разменьвала золата
свайго рубля.
І шпачыная нота раптам прарэзалася
У маладога нахохленага вераб'я.

Чакала высокае неба бясхмарнае
Гулкага жаўруковага гімна...
А радыё
хрыпла
аб'явіла:
«Юрый...
Гагарын...
Загінуў...»

І здаецца —
горла раўчукоў прыдушылі сумёты,
Яшчэ цясней прымёрзлі да стрэх ледзяшы.
Замятала чорная мяцеліца самоты
Вясновую радасць душы.

Надзея ўспыхнула —
Радыё магло памыліцца
(Хіба яно толькі праўду гаворыць запар
столькі гадзін?),
І цэлы свет гатовы быў памаліцца,
Хаця на свеце багоў — многа,
А ён быў адзін.

Роспачна ў сэрца ламілася думка
трывожная,
Як вавёрка ў коле,
Шукала выйсця то там,
то тут.

А можа?
А можа?

Бывае ж цуд...

Але радыё
паўтарала
словы
панура.
І былі бяссільныя ўсе багі.
Юра-а-а!
Юра!
Не збераглі...

II

Ён любіў сонца.
Ён сам быў падобны да сонца,
Якім яго дзеці малююць, —
З шырокай усмешкай
І вачамі, поўнымі святла.
Ён яго бачыў
і далёка-далёка —
За вёскай,
Над соснамі,
І блізка-блізка —
Ля самага крыла.

Ён бачыў яго і маленькім,
лагодным —
Вяснушкаю на Валіным твары,
І вялікім і грозным —
За ілюмінатарам касмічнага карабля.
Яно
то кацілася
Святочным доччыным шарам
па тратуары,
То вячэрнім матчыным акном
Міргала здаля.

Яно
то распускалася цюльпанамі Байканура,
То загаралася крамлёўскімі рубінамі ўначы,
То раптам над хваляй марской падскоквала:
— Юра! —
І рассыпалася на тысячу сонцаў,
Пругкіх,
як баскетбольныя мячы.

Яно з ім было і тады,
Калі ён адлятаў у бяссмерце,
Разламаўшы зямнога прыцягнення абручы,
І тады,
Як вярнуўся,
Сухімі вуснамі хапаючы волжскі вецер,
І расінка зоркаю ўспыхнула на плячы.

І тады —
Было неба
і шчодрае сонца,
Якое павольна
над лёгкімі аблачынамі ўсплыло,
Нібы апельсін пераспелы —
І яго ным сокам

Заліло самалёта халоднае крыло.

А потым
пачала зямля набліжацца,
Закруціўся шалёны калейдаскоп:
Белавежская пушча.
Вулачкі Гжацка.
Волга.
Зорны гарадок.
Перакоп.
Вагоны.
Пероны.
Трыбуны.
Турбіны.
Каралёў.
Камароў.
Узлётнай пляцоўкі бетон.
Сігналілі «МАЗы».
Алені трубілі.
Гул...
Звон...
Звон...

Сонца
пахіснулася
І змяншацца стала.
Вось яно ўжо,
як мячык,
Якім у дзяцінстве гулялі ў лапту —
Чорны,
з гумы,
здзёртай з фашысцкага танка.
Удар!
Мячык паляцеў.
І патух.

Неадкрытая зорка
на халоднае дрэва
Упала самлелаю страказой.
Па сінім воку неба
Самалёт скаціўся слязой...

III

Чорныя стужкі звісалі хмура.
На ветры пальцы ззалелі.
Плыла
абвітая вянкамі
урна
Каля Маўзалея.

Маўчала Чырвоная плошча ў знямозе.
Як затрыманае рыданне —
ціша ў Крамлі.
Плыла
над зямлёй
па апошняй дарозе
Жменька сплаўленай з небам зямлі.

Жахліва цяжкая ноша гэта,
Над плячамі ўзнятая ў сіняву...

Стаіла дыханне планета.
Чалавецтва схіліла галаву.

Устаньце,
Усе імператары і прэм'еры!
Выньце рукі з кішэняў,
Усе прэзідэнты і каралі!
Здыміце
        кароны,
шляпы,
        самбрэра
Перад прахам
        вялікага сына Зямлі.

Вы,
        самі сабе начапляўшыя ордэнаў на
лацканы,
Аблізаныя падхалімамі
        з галавы да пят,
Да апусцелага «трона»
        смаленскага хлопца сялянскага
Нават і ў сне не зможаце дапяць.

Вас,
        ад прамоў і паседжанняў асавелых,
Можна тасаваць,
        перамяшчаць,
Прывозіць з-за граніц.
А простага маёра савецкага
Нельга
        ні скінуць,
        ні замяніць.

І калі Час зоймецца гісторыяй сённяшняй
І вызначыць цану
        вашых спраў
І напісаных бойкімі памочнікамі слоў,
Юра
Праз пыл,
        што ад вас застанецца,
Будзе ўсміхацца сонечна.
Так што,
        Панове,
        шапкі далоў!..

Развітальныя словы закамянелі на губах.
А стрэлкі Спаскай вежы пасоўваліся
        няўмольна і ўпарта.

І вось —
Адгрымелі залпы.
Замоўклі Моцарт і Бах.
Яліны сталі ў ганаровую жалобную варту.

IV

Расцяклася па вуліцах прыглушаная гамана.
На Чырвонай плошчы —
Бязлюдна і ціха.
Асталіся з Юрам
        Крамлёўская сцяна

і яна —
Валя,
Валянціна.

О, як ёй зайздросцілі жанчыны
ўсіх мацерыкоў —
Шчасцю яе
І зямной жаночай уладзе,
Калі можна яму
валасы ўскудлаціць рукой
І халоднымі пальцамі
Шчаку непаголеную пагладзіць.

О, як цяпер яна зайздросціць
усім жанчынам зямлі,
Што чакаюць дадому мужоў,
Бягуць да сваіх нарачоных!
Юравы плечы сягоння
не рукі яе абвілі —
Рамка чорная.

Акуляры шэрым туманам завалакло.
Знаёмы шрам над ягоным брывом
Шукаюць яе сляпыя пальцы —

І
на шкло,
На халоднае шкло
Натыкаюцца.

Ён і на гэтым партрэце
не здолеў усмешку схаваць.
Так і не навучыўся выглядаць
паважна і хмура.
Хлапчук.
Лейтэнант.
Адчаяная галава.
Юра!..

Ганаровая варта ідзе да Маўзалея,
Крокамі ламае немату.
Куранты прывычна звоняць...
Больш, чым Млечны Шлях,
Ён хацеў пабачыць дачок вясельную фату.
І хацеў пацалаваць
Першую серабрынку ў яе на скронях.

Там, дзе ўпаў самалёт,
Прарасце трава.
Другога маёра
закалыша волжская хваля...
Не плач,
Валянціна!
Трывай!
Трымайся,
Валя!

Стогн свой роспачны прыдушы,
Над вянкамі ўзніміся.

Не скора
Зарубцуецца ў чалавецтва ў душы
Тваё ціхае жаночае гора...

V

Адкаласяцца гады.
Дні праляцяць заклапочаным роем.
Неба прашыюць новымі трасамі караблі.
А ў нас
Будзе біцца сумленне,
Як жылка на скроні:
«Не збераглі».

Адкінуць здагадкі і адгаворкі,
Не звернуць увагі на помнікі і вянкі,
Калі не віной,
          дык папрокам горкім
Гэтую смерць нам прыпомняць вякі.

Можа, за клопатнасцю і тлумнасцю,
Што перапоўнілі жыцця берагі,
А можа, за чэрствасцю і бяздумнасцю —
Не зберaглі.

Мы грэліся мілаю усмешкай ягонаю,
Букетамі сцежкі яму мялі,
Сыпалі зоркі на грудзі і на пагоны
І —
Не зберaглі...

Так,
гора сціхае,
і боль атухае,
і роспач перастае шчымець.
Мінае, канае часіна ліхая.
І радасць усмешку раскатурхае,
І новымі маршамі выбухне медзь.

І сонца затопіць лугі заліўныя,
І мільёны зялёных ракет ірвануцца
          з раллі...
А сэрца
          раптам
          заные,
          заные:
«Не зберaглі.
Не зберaглі».

VI

А ці захацеў бы ён,
Ці дазволіў
Сябе ад будзённых клапот берагчы,
Узбіць на жаданні свае і волю
Абмежаванняў крутых абручы?

Хіба ён бы змог
стаць
          жывым экспанатам,
Музейным дзівам,
          цацкай для новых эпох,

Калі быў
чалавекам,
касманаўтам
І быць інакшым не мог?

Яго абблытвалі серпанцінам парадаў,
Аглушалі тостамі,
абклейвалі ўсмешкамі каралёў.
А ён
стамлёна закрываў вочы —
І бачыў
Ладагу
І цесныя кабіны касмічных караблёў.

І яму хацелася
саскочыць з партрэтаў,
Уцячы ад эскортаў —
Імчаць басанож па лугах,
Галёкаць па лесе —
Каб каціўся трэтар —
І заснуць сярод поля,
У стогадовага дуба ў нагах.

Ён хацеў
карабкацца па скалах стромых,
Па гулкім стэпе ганяць шалёны табун,
А не толькі раскланьвацца ветліва на прыёмах
Ды махаць рукою з трыбун.

Ён дазволіць не мог,
каб славай
закрылі
Ад яго
неразведаны небасхіл.
Калі ў чалавека вырастаюць крылы,
Ён павінен лятаць,
Не складаючы крыл.

І, пэўна, гэтакі лес у сапраўднага сокала —
Не паспеўшы стаміцца і пастарэць,
Узляцець над зямлёю высока-высока,
У разбуджаным небе сустрэць сваю смерць.

І нікольκі не крыўдзячы жальбы нашай,
Затрымаўшы ў грудзях развітальны крык,
Можа, ён і не марыў аб смерці інакшай,
Чым такая —
У небе,
Не складаючы крыл.

VII

Прарэжа памяць чырванапёрай стронгай
Гадоў успененыя перакаты.
І ляжа на вагі гісторыі строгай
Наш горды і кляты век дваццаты.

І будзе ён, пад рэнтгенам нібы,
Пад чыстым паглядам нашых патомкаў —
І лускою асыплюцца патухлыя німбы,

І незаўважаныя зоркі замігцяць папацёмку.

І Рэвалюцыя ў ім будзе біцца,
як сэрца.
Будзем кропелькамі крыві
ў ім пульсаваць мы самі.
І навекі думка ленінская застанецца.
І ўсмешка гагарынская —
таксама.

* * *

Хто раней,
хто пазней,
Толькі ўсе
Зноў і зноў
Мы прыходзім
Да простых,
як хлеб і паветра,
Высноў:

Што жыццё чалавеку —
Любому —
Даецца адно,
І што,
як ні надточвай,
Кароткае вельмі яно,
І што праўда на свеце
Адна —
Без крупінкі маны,
І што шчасця на свеце
Няма
Без сваёй стараны...

Колькі б ты ні мудрыў,
Як ні кідаўся б ты,
А прыходзіш
Да гэтай святой прастаты.

І ўзыходзяць

Над лесам
Пражытых табою гадоў
Непагасныя зоркі
Законаў бацькоў і дзядоў.

Прарастаюць зярняты
Яшчэ невядомых навук
На шырокіх далонях
Натруджаных рук.

І нідзе
Не схавацца
Ад сынавых ясных вачэй.
І на свеце тады
Жыць
        намнога цяжэй
І лягчэй.

* * *

Люблю свой край,
        зялёны і спакойны.
Сіваваронкі дрэмлюць на слупах.
Над хатамі —
        вясёлыя шпакоўні,
А ў хатах —
        аржанога хлеба пах.
Усё вакол
        знаёмае да болю:
Збягаюць незабудкі да вады,
Сядае важна бусел на таполю,
Ад ластавак абвіслі правады.

На ноч сплывае сонца за жытное.
Свой невад туманы павалаклі...
Святое,
        непрыдуманае,
        тое,
Чаго не знойдзеш на чужой зямлі...

Такім свой край
        навек люблю і помню.
І калі згасне сонца у вачах,—
Мне будуць сніцца
        кожны дзень
        шпакоўні
І аржанога хлеба родны пах...

* * *

У звышсучаснай каламуці,
Нібыта «іжыцу» і «яць»,
Старыя правілы чамусьці
Мы пачынаем забываць.
Не прадпісанні-аднадзёнкі,
Што напяклі пісарчукі,
А нашых продкаў завядзёнкі,
Якіх трымаліся вякі.
Хіба іх помніць больш не трэба?..
Здавалася б, чаго прасцей:
«Не папракай кавалкам хлеба
Бацькоў, нашчадкаў і гасцей».
Чаго ясней: «У беднай хаце,
Дзе на цвіку вісіць сума,
Не заікайся пра багацце,
Бо тут яго даўно няма».
І ўжо зусім ніякавата
Не знацца з ісцінай такой:
«Пажар тушыць і ставіць хату
Найлепш суседскай талакой...»
Усё праверана вякамі
І над бяздумнаю травой
Прыбіта вопыту цвікамі
На браме памяці жывой.
І хоць на мудрасць не скупая
Зямля, дзе сёння мы стаім,
Нам так часамі не хапае
Служэння правілам старым!

* * *

Грукочуць дрогкія калёсы,
І ўслед за спуджаным канём —
Чорнавалосы і бялёсы —
Імчаць падлеткі сугрунём.

Мільгаюць збітыя калені,
Трымцяць кашулі на плячах.
І першароднае здзіўленне
Аж скача ў радасных вачах.

Ім дзівам казачным здалося,
Што па асфальце гарадскім
Грымяць падковы і калёсы,
Не выдуманыя нікім,

Што конь
            жывы —
            глядзіце самі —
Перад арудаўскім пастом
Б'е капытом,
            стрыжэ вушамі,
Махае стрыжаным хвастом...
Вось так прыходзяць з новым часам
І казка новая,
            і быль...
Здаецца, ўчора
            я імчаўся,
Каб паглядзець аўтамабіль...

ЖАВАРАНАК НАД ПРАСПЕКТАМ

Успырхнуў жаваранак над праспектам,
Затрымцеў,
        утрапёны і горды,
Над асфальтным прапыленым пеклам
Стаў паласкаць дажджынкаю горла.

Шэрымі крылцамі лопае-лопае,
Дзюбай паўдзённае сонца казыча —
І ляцяць
        халодныя
        срэбныя кроплі
На вусны дзяўчатам,
        міліцыянерам на лычкі.

І ловяць іх клёны ў зялёныя прыгаршчы.
І коцяць перад сабою тралейбусы,
Асцярожненька,
        тармазамі не скрыгаючы,
На хмурынку закінуўшы сталёвыя лейцы.

Я стаю, усміхаюся,
        як дзіця, расчулены.
А побач нехта хмура пакрэктвае.
Божа,
        няўжо ён не чуе
Жаваранка над праспектам?..

РЭКІ БЕЛАРУСІ

О, рэкі, рэкі Беларусі
Сярод лугоў, сярод лясоў!
Калі я гімн саткаць збяруся
З блакітных вашых паясоў?
Не дзеля славы мімалётнай
(Ах, што там крытыкаў басы!),
А дзеля вашай паўнаводнай
І нестарэючай красы.
Як мне салодка з вас пілося!
Як сняцца,
        што ні гавары,
І вашы завадзі, і плёсы,
І лукавіны, і віры,
І ластаўкі на вашых кручах,
І цень ад вербаў і бяроз,
Ля берагоў —
        аер пахучы,
Чарот і талака стракоз...
Здаецца,
        што перад другімі
Вы выставіце напаказ? —
Ані парогаў,
        ані гімнаў,
Ані плацін няма у вас.
А я з маленства сэрцам рвуся
Ткаць песні з вашых паясоў,
О, рэкі, рэкі Беларусі
Сярод лугоў, сярод лясоў!

* * *

Часамі нахлыне сумненне:
Ці ты не ўпустую кіпеў,
Ці знойдзе ў каго разуменне
Твой клопат і праведны гнеў?

А што, калі боль твой дарэмны
І ён не разбудзіць ані
Чужога сумлення,
          што дрэмле
У сытай тупой цішыні?

Трывожна,
          пакутна
          і горка
Агортвае роздум цяжкі.
Не цешыць душу адгаворка,
Што час наш і век наш такі.

Не веру,
          не веру,
          не веру,
Што служым выгодзе адной
І свет наш забіты даверху
Маной,
Мітуснёй,
Балбатнёй,

Што бытам нейлонным закрыты
Далёкі сівы небасхіл
І лыч адарваць ад карыта
Ужо не знаходзіцца сіл,

Шануецца чан, і тапчан свой,
І спрытна адхоплены куш
І подлай мараллю мяшчанскай
Так многа спустошана душ...

Ёсць хіжыя,
          злыя,
          дурныя,
Прайдохі,
Дзялкі,
Махляры.
Пляваць ім на буры зямныя.
Іх вабіць зацішак нары.

Ды знаю:
          мяне зразумеюць
Не тыя, што гучна крычаць,
А тыя, што плакаць умеюць
І горка, самотна маўчаць,

Што, з лютасцю сціснуўшы зубы,
Працуюць,
          глытаючы пот,
Ратуючы свет наш ад згубы,
Не просячы лішніх даброт.

Няхай нават гэткіх і меней —
На строгі іх суд аддаю
Усе свае сны і сумненні,
Любоў і надзею сваю.

КАМПРАМІСЫ

Ах, кампрамісы, кампрамісы —
Улева крок ці ўправа крок.
І ўжо жандар праходзіць міма,
І ўжо не ўзведзены курок.

І ўжо не выдумкаю злою
І не абразлівым радком,
А літасцівай пахвалою
Цябе аблашчваюць крадком.

Табе руку падаць гатовы,
Хоць і з аглядкаю,
а ўсё ж...
А за спіной — напагатове
Крывы, з зазубінамі, нож.

Ах, кампрамісы, кампрамісы —
Малочных рэчак берагі.
Давай другім і сам карміся.
Кінь сухары — еш пірагі!

Табе ваду заменяць супам,
Худы сяннік — пухавіком.
Ты толькі волю дай уступкам,
Сярод ваўкоў завый ваўком.

Ты толькі збоч,
ты толькі збойся,

Зняверся ў нечым хоць на міг —
І лоўка прашмыгне забойца
Тваіх сяброў, ідэй тваіх.

Ах, кампрамісы, кампрамісы —
Стратэгій тонкая гульня.
А ўжо душу халоднай пысай
Вынюхвае шпікоў гайня.

І ўжо ўсучыць лаўчыцца вораг
Свае паскудныя дары.
І ўжо сырэе гнеўны порах.
І ўжо тупеюць тапары.

А потым будзе кроў дыміцца,
Ударацць боты па касцях...
Ах, кампрамісы, кампрамісы!..
І рукі выпускаюць сцяг...

* * *

Ад матулінай пачосткі
І ад бацькавых папруг
Я ўцякаў далей за вёску,
На шырокі летні луг.
Бег расхрыстаны і босы
Пад зялёныя дубы.
«А куды ж ты?» — «На нябёсы,
Дзе ні крыку, ні журбы».
Па раскідзістых галінах
Узбіраўся ўсё вышэй —
Ад папрокаў, напамінаў,
Ад усмешлівых вачэй.
Лез туды, дзе ззялі далі,
Дзе, як богавы паслы,
На адной назе стаялі
Задуменныя буслы.
З небам там перапляліся
Цёплы цень і цішыня.
Я і сам быў сярод лісця,
Як малое птушаня.
Адплывалі штохвіліны
Пад зялёны роўны шум
Крыўды ўсе і ўсе правіны,
Прасвятляючы душу...
І цяпер, як сум атуліць,
Я туды ж імчу хутчэй...
«А куды ж ты?» — «Да матулі,
Да матуліных вачэй...»

ВЯРТАННЕ ПЕСНІ

Ансамблю «Песняры»

Аж хістае сцены палацаў
Гучных воплескаў вадаспад,
Калі хлопцы
«Скрыпяць мае лапці..
Запяюць на сучасны лад.

Сэрцу радасна і балесна
Ад таго,
як прыходзіш зноў
Ты, мая беларуская песня,
Да сваіх і чужых сыноў.
Дзе тыя выжарыны,
Дзе тыя прашчуры,
Што цябе, як жаваранка,
Бераглі і лашчылі,
У туманы хуталі,
Грэлі пад пахаю,
Ціхую-ціхуткую,
Верасам прапахлую?..
Як крынічка,
праз камні і наледзі
Ты прабілася з роднай зямлі,
І ніякія беды і нелюдзі
Замуціць цябе не змаглі.
Ты ж мая адзіная,
Ты ж мая ніўная,
Ты ж мая радзінная,
Ты ж мая жніўная,
Ты ж мая вясельная,
Ты ж мая вясенняя,
Ты ж мая нязваная,
Ты ж мая нязнаная,
Да грудзей прытуленая —
Матуліна...
Спявайце ж, хлопцы, спявайце!..

У ДАРОЗЕ

Я зноў зялёнай магіі дарог
Душою падарожніка прадаўся.
І вось, нібы сярэбраны гарох,
Дождж барабаніць па вагонным даху.

Цяжкія колы над зямлёй грымяць
З далёкімі грамамі ўперамешку.
А луг заве саскочыць
і прымяць
Званочкі танканогія на ўзмежку.

Праносяцца слупы і правады.
Наўзбоч —
калюг блішчастыя асколкі.
У небе з чыстых кропелек вады
Гром выкаваў сабе дугу вясёлкі.

П'яніць гаёў абмытых гамана.
І мне, зачараванаму, не сорам,
Што, як хлапчук, прынікнуў да акна
І захлынуўся ветрам і прасторам.

ШУКШЫНСКАЯ КАЛІНА

Як ручаі,
між берагамі
Турботы коцячы свае,
Каля яе мы прабягалі,
Не заўважаючы яе.

Нам болей кідаліся ў вочы
У восеньскім святле скупым
Дубы старыя ля абочын,
На голых просеках слупы,
Апаленыя кроны клёнаў,
Шпачыны вырай на вярбе...

Ды вось — спыніліся ўтрапёна,
Яшчэ не верачы сабе.

Як налілася сокам горкім,
Як заірдзелася яна —
З усіх нізін, з усіх узгоркаў
Адна на ўвесь абсяг відна.

У цёплай сіні сакалінай,
Чырвоная, нібы ў крыві,
Стаіць шукшынская каліна
Сярод някошанай травы...

Я —ТВОЙ ТРУБАЧ

Я — твой трубач,
таварыш камсамол,
Што для мяне скупыя рамкі ўзросту,
Калі тваіх дарог крутыя вёрсты
Пазначаны гісторыяй самой!

Хіба цябе састарылі гады!..
Пакуль святло ў вачах не пахіснецца,
Пакуль тваім агнём сагрэта сэрца,
Я буду ненасытна малады.

Ну, а калі ў нагах не стане сіл
І я ў дарозе зморана прылягу,
Ты маладосці мне налі ў біклагу
І да сасмяглых вуснаў паднясі.

Я пракаўтну і горкі пыл, і соль
І звонкую трубу да сонца ўскіну
І пратрублю,
пад ветрам стаўшы,
сыну
Твой юны марш,
таварыш камсамол...
Я — твой трубач...

ЧАТЫРЫ ПЕСНІ ПРА ЭРНЕСТА ЧЭ ГЕВАРУ

Не трэба аркестра,
Хай пальцы разбудзяць гітару.
Спяём пра Эрнеста,
Спяём пра Эрнеста Гевару.
Няхай уваскрэсне,
Як водгулле цугляў начлежных,
Далёкая песня —
Сяброўка нагор'яў мяцежных.

Нам залы не трэба.
І люстраў крыштальных не трэба.
Хай стомлена дрэмле
Над намі глыбокае неба.
Спяём пра Эрнеста
З усмешкай, як снег, белазубай,
Пра С’ера-Маэстра —
Мачэтэ разгневанай Кубы.

Не трэба авацый.
Хай гучнаю славаю стане
Тратыл,
што ўзрывацца
Пачне ў непрыяцельскім стане.
Спяём пра маёра,
Што жыў, як спрасованы порах,
Якога не скора

Забудзе спалоханы вораг...

Не трэба аркестра,
Хай пальцы разбудзяць гітару.
Спяём пра Эрнеста,
Спяём пра Эрнеста Гевару,
Пра грэшнага бога,
Што з куляй навек абручылі,
Пра хлопца,
якога
Любілі сябры і жанчыны...

ПЕСНЯ ПРА БІНТЫ І ПАТРОНЫ
(Алегрыя-дэ-Піо, 5 снежня 1956 г.)

Над рыжым балотам, над сцежкай крывой
Карэнне сплялося,
як краты.
У мангравых нетрах сцякаюць крывей
І падаюць моўчкі салдаты.
А ўверсе тупое гудзенне вінтоў
І бомбы пад сонцам паўдзённым.
Даўно не хапае атраду бінтоў,
А больш не хапае патронаў.

З няволі сляпой прараслі кулакі,
Як помсты вясновая завязь.
І ў цёмныя горы вядзе нацянькі
Глухая святая нянавісць.
Як гнеўныя міны, стагоддзі бяды
Пакладзены грозна пад троны.
Салдатам свабоды патрэбны бінты,
А болей патрэбны патроны.

Зямлю кулямёт выбівае з-пад ног,
У злосным запале шалее.
Пад кулямі горкне цукровы трыснёг
І плача,
як сотня жалеек.
І падаюць злева і справа браты,
Бяссільна радзеюць калоны.
Свінцоваю стомай набраклі бінты

І лютым адчаем — патроны.

Нялёгка прабіцца праз кулі і кроў,
Дзе стогны змяшаліся з крыкам.
Напоўнен бінтамі рукзак да краёў.
Патронамі поўная скрынка.
Падумай,
    Эрнеста,
    што выбераш ты
Для бітвы цяжкой і бяссоннай.
Патрэбны ўрачу, як ніколі, бінты.
Салдату патрэбны патроны.

Ці многа наперадзе новых атак,
Залішне гадаць недарэчы...
Рашуча адкінут з бінтамі рукзак,
І ўзвалена скрынка на плечы.
І ўзнята вінтоўка ў імя дабраты
З запасам адвагі патройным...
Салдату Свабоды патрэбны бінты,
А болей патрэбны патроны!..

ПЕСНЯ ПРА ДЗЯЦЕЙ СЕЛЯНІНА РОХАСА
(Балівія)

У Рохаса іх васьмёра —
Галодныя і крыклівыя.
Вялізную торбу гора
Ты сшыла для іх, Балівія.
І кінула іх, падлёткаў,
Пад ліўні жыцця бурлівыя,
Як трэскі разбітай лодкі
У рэкі свае, Балівія.

У Рохаса іх васьмёра —
Як жаваранкі з-пад хмары,
Яны ўзляталі да зораў
У дужых руках Гевары.
Даверліва і нялоўка
На цёплым плячы сядзелі.
І гладзіў ён ім галоўкі
Шурпатай рукой надзеі...

У Рохаса іх васьмёра —
Слабыя і палахлівыя.
Цярплівасці і пакоры
Вучыла ты іх, Балівія.
Іх часта пад рэбры біла
Няўдача — каза бадлівая.
Нічога ты не зрабіла,
Каб іх засланіць, Балівія...

У Рохаса іх васьмёра...
Хацелася вельмі бацьку
Заместа злосці і зморы
Прынесці дамоў багацце.
І ён атрымаў далары,
Хоць здраднікам плоцяць мала.
А восем байцоў Гевары
Па восем куль атрымала...

У Рохаса іх васьмёра —
Суровыя і маўклівыя.
Яны падзялілі сорам
І ганьбу тваю, Балівія.
Яны зразумеюць скора,
Чаму дасюль нешчаслівыя,
І глянуць тады з дакорам
У вочы твае, Балівія...

ПЕСНЯ ПРА АПОШНІ ЎРОК
(Ігера, 9 кастрычніка 1967 г.)

Пад вокнамі стражнік пастаўлен.
Стаіць за дзвярамі канвой.
Ды толькі не вязень —
            настаўнік
Заходзіць у класны пакой.

Хоць скручаны белыя рукі
І рана нясцерпна пячэ,
Свой курс палітычнай навукі
Ён выкласці зможа яшчэ...

Чаго ж ты змянілася з твару,
Чаго ж ты замоўкла,
            Картэс,
Пабачыўшы зблізку Гевару,
Пачуўшы адкрыты пратэст?

Ён смерці сваёй не баіцца —
Усмешкай асветлены твар.
Стаіш ты над ім вучаніцай,
Што дома забыла буквар.

Яму б тут аддыхацца трошкі,
Асвойтацца ў школьнай цішы.
Ён сцёр бы памылкі ўсе з дошкі
І з чыстай наіўнай душы.

Табе,
спалатнелай дазвання,
Як вернай сяброўцы ў страю,
Ён шэпча,
нібы заклінанне,
Пра мілую Кубу сваю...
...Жандары ўбягаюць таропка.

Узведзен няўмольны курок.
Ну вось і пастаўлена кропка.
Ну вось і закончан урок...

ПЕСНЯ ПРА КАМАНДАНТЭ ЧЭ

Прывыклі мы праўдзе салдацкай
глядзець у бяссонныя вочы.
Ні Богу,
ні тайным замовам,
ні казкам не верым яшчэ.
І ўсё-такі поплеч з намі
ты ў свеце трывожным крочыш,
Жывы камандантэ Чэ.

Дарэмна ўсміхаецца вораг,
што пасткі расстаўлены лоўка, —
Хай сэрца тваё расстраляе
і рукі твае адсячэ, —
Ніколі не заржавее
і ў пыл не ўпадзе вінтоўка
Твая, камандантэ Чэ.

Плыве над туманам адчаю
твой стомлены твар барадаты,
І ў сонных жылах Амерыкі,
як ток электрычны, цячэ
Уся,
да апошняй кроплі,
бунтоўная кроў салдата —
Твая, камандантэ Чэ.

Калі ж над задымленым светам
замоўкнуць усе кананады

І горнае сонца свабоды
прагоніць самоту з вачэй,
На плошчы
у бронзе і ў мармуры
выведзеш зноў атрады
І ты, камандантэ Чэ.

І пальцы разбудзяць гітару,
і сядзем сябрынаю цеснай,
А водсвет мяцежных вогнішчаў
нам сэрцы ізноў апячэ.
І мы яшчэ даспяваем
твае суровыя песні
З табой, камандантэ Чэ.

* * *

«Што ты так прыкуты да Радзімы?
Часам чую хітранькі дакор. —
Свой лясны куток незамянімы
Памяняй на ўвесь зямны прастор.

Расхіні душу сваю шырока —
І не ціхі плёскат ручаёў,
А магутны акіянскі рокат
Хай яе напоўніць да краёў.

Кінь зацішак баравы, ажынны —
Пі самум пякельны, як пяршак.
Вырвіся з запыленых сцяжынак
На бетонам сцелены бальшак.

Паглядзі, як шмат пад небам сінім
Неспазнаных прэрыяў і гор!..»

І каму не здасца прагрэсіўным
Гэты палкі заклік і дакор?

Я ж і сам хачу пабачыць свету,
Памаўчаць ля вечных таямніц
І калі не іншыя планеты,
Дык хоць нашу ўведаць да драбніц.

Сам хачу ацэньваць не завочна
Па чужых славутасцях маршрут...

Толькі вось для гэтага навошта
Забываць або мяняць свой кут?

Чым такім ён горшы між астатніх,
Чым ён знаўцам мод не дагадзіў,
Што прыціх, някідкі ды заштатны,
У баку ад экзатычных дзіў?

Для мяне ён непаўторна любы.
Мне з яго відно на ўсе бакі,
Тут, каля гаёў зеленачубых,
Спяць мае дзяды, жывуць бацькі.

Тут мае прыстанішча і шчасце,
Тут мой лес, мой боль і запавет.
Тут я сэрца адчыняю насцеж
Для ўсяго, чым знакаміты свет.

І хай з тысяч рэк чужых нап'юся —
Толькі для апошняга глытка
Я прыйду сюды,
            да Беларусі,
Да свайго азёрнага кутка.

* * *

Уцякаюць хлопцы ў гарады,
Ад зямлі бацькоўскай уцякаюць.
Іх плугі і косы не цікавяць,
Надакучыў жніўня пыл руды.

Што паробіш? Можа, век такі?
Можа, ўмеюць хлопцы час падслухаць?..
Вёска, нібы дзеўка-векавуха,
Пазірае ўслед ім з-пад рукі.
Не гукне, не ўсхліпне наўздагон.
Хай ідуць, няхай у шахты лезуць,
Здабываюць вугаль і жалеза,
Прыручаюць вецер і агонь.

На палях не ўзыдзе кураслеп...
Ды пад старасць хлопцам здасца дзівам,
Як гэта зямля без іх
            радзіла
Аржаны незамянімы хлеб.

* * *

Сняжынкі на расстанне,
Дажджынак першы звон.
Салодкае вяртанне
У красавіцкі сон.

Там пад зімовай маскаю —
Вясны гарэзны смех.
Там, як вяснушкі майскія, —
Праталіны праз снег.

Над соснамі, асінамі
Гуляюць па бары
Зялёныя і сінія
Залётныя вятры.

На вербах разапрэлых
Скідаюць кажушкі
Нахохленыя, белыя
Тугія каташкі.

І сонца хмары ссоўвае,
Глянцуе неба сінь.
І ўсё вакол часовае,
Няпэўнае зусім.

Але ўжо над таполямі
З відна і да відна
Крыламі б'е няўтольная,
Няўмольная вясна.

* * *

Слова наша роднае,
хапала
На стагоддзі доўгія цябе.
Багдановіч, Колас і Купала
Прыпадалі да цябе ў журбе,

Адкідалі кпіны і абразу,
З дзён былых цягнулі ў заўтра ніць
І хаця не ўсіх і не адразу, —
Навучылі ўсё ж цябе цаніць,
Вымытае ў гулкіх навальніцах,
Нам як запавет перадалі,
Каб пілі і не маглі напіцца
І ўзнялі наўздзіў усёй зямлі.

Матчына нявыцвілае слова,
Даўжнікі мы вечныя твае...
Так нам не хапае Куляшова.
Мележа так горка не стае.

Нам цяпер цябе на раздарожжах
Берагчы за іх і за сябе,
Даражыць пявучым гукам кожным,
Як зярняткам чыстым на сяўбе,
Каб не адляцела, як салоўка,
Не аглухла ў гуле бальшакоў...
Строга з нас вачэй не зводзіць Броўка.
Стоена ўзіраецца Лынькоў...

Мова продкаў нашых і нашчадкаў —
Шэпт дубровы і пчаліны звон, —
Нам цябе ласкава і ашчадна
Спазнаваць ажно да скону дзён,
Па чужых краях не пабірацца,
Не аддаць цябе на забыццё,
Наша невычэрпнае багацце,
Наша несмяротнае жыццё.

УДЗЯЧНЫ ЛЁСУ...

Я ўдзячны лёсу,
          што з усіх краёў
Ён выбраў для мяне навекі
          гэты,
Дзе бальшакі прастуюць між гаёў,
А па сцяжынках коцяцца ранеты,
Дзе Нарач мые сінія шаўкі
І п'юць з Дняпра паўдзённыя вясёлкі,
Дзе з салаўямі дражняцца шпакі
І жыту голас дораць перапёлкі.
Я ўдзячны лёсу, што ў сябры мне даў
Далёкія і блізкія дарогі
Да прыамурскіх сосен і застаў
І да вяршынь Паміра крутарогіх,
Да кіеўскіх пявучых вечароў
І прыбалтыйскіх гаркаватых ветраў,
Да звонкіх чар малдаўскіх ганчароў
І велічнай маўклівасці Ай-Петры.

Я ўдзячны лёсу, што ва ўсе часы
Мая блакітнавокая радзіма
Не засланіла мне чужой красы,
Мяне ад свету не адгарадзіла,
Што не магла,
          не ўмела быць другой,
Жыла ў суседстве і братоў цаніла
І што ў сябрыне нашай дарагой
Яе завуць усе сястрою мілай...

ЛІСТЫ Ў ЛЕНИНГРАД

КРЭЙСЕРУ «АЎРОРА»

Ты для мяне —
не грозная рэліквія
На п'едэстале велічнай Нявы,
А вечная гісторыя вялікая,
Майго зямнога лёсу вартавы.

Калі ўзыходзіць раніца па трапу
І над табою паднімае сцяг,
Уздрыгваюць тыраны і сатрапы
У гэты міг на ўсіх мацерыках.
І помніць свет няроўнасці пракляты,
Што на яго глядзяць з нядаўніх пор
Твае незачахлёныя гарматы,
Як вочы справядлівасці,—
ва ўпор.

І ведаюць байцы перад атакай
На векавы нявольніцкі рубеж:
Як стане цяжка —
ты падымеш якар
І ў стомленае сэрца прыплывеш...
Калі ж нязвана ўзыдзе ў небе зыркім
Рашучай бітвы ачышчальны дым,
Прашу:
дай мне таксама бесказырку
З тваім кароткім імем залатым.

ПІСКАРОЎСКАМУ МЕМАРЫЯЛУ

Я стаю на каленях
Перад тваім векавечным спакоем.
Я не кветкі прынёс табе —
Памяць
і боль незатоены.
І маўчу,
Да халоднага ветру прыпаўшы шчакою.
Я маўчу,
Бо няма ў мяне слоў —
Толькі стогны.

А навокал —
Курганы,
курганы,
курганы
Ці проста вялікія труны,
Травою зарослыя,
Дзе па-брацку —
Плячом да пляча —
Пахаваны
Блакадныя зімы,
Блакадныя вёсны.

Я не плачу.
Навошта слязамі трывожыць
Ленінградскую мужнасць,
Ленінградскую гордасць?

На курганах трава —
Як на сумных восеньскіх пожнях, —
Пад «нулёўку» падстрыжана,
Палынамі прагоркла.

Твае сцежкі —
Нібыта рубцы на пакутніцкім сэрцы,
Нібы трэшчыны чорныя
На зялёным ладажскім лёдзе.
Па іх страшна ісці.
Па іх трэба прайсці чалавецтву —
З галавою пахіленай,
Як Ленінград кожны вечар праходзіць.

Я прайшоў твае сцежкі.
Твае надмагільныя пліты
Я з плячэй сваёй памяці
Не здыму ўжо ніколі, ніколі.
А ў горле —
Камяк тваёй цішыні недапітай.
А трава твая шорсткая
Колецца,
        колецца,
        колецца...

ДОМУ № 45 ПА 4-Й ЛІНІІ
ВАСІЛЬЕЎСКАГА ВОСТРАВА

Я табе па сяброўску зайздрошчу,
Во жыве ў тваім ціхім двары,
Як матыў паўзабыты, стары,
Лёгкіх крокаў Купалавых пошчак.

Ты шчаслівы,
Ты бачыў яго.
Калі дожджык балтыйскі цярусіў,
Песні-сны баравой Беларусі
Выпускаў ён з-пад даху твайго.

І ўглядаліся ў цемень акна
Яго мудрыя карыя вочы,
І гучаў яго голас прарочы
У глухой цішыні давідна...

Ён і сёння паўночнай парой
Крокам лесвіцу будзіць старую.
У пакоях тваіх кватаруе
І дагэтуль ягоны настрой.

І блішчаць камяні у двары,
Быццам месяц іх вылепіў з воску.
І прашу я цябе па-сяброўску:
Хоць адзін з іх ты мне падары.

У маўклівым цяжкім камяні

Крок ягоны усё яшчэ стыне,
Як мурашка ў халодным бурштыне, —
Напамінам пра даўнія дні...

КАСКАДУ ПЕТРАДВАРЦА

Мне зноў здаецца апантана,
Што я стаю сярод зямлі,
А навакол твае фантаны,
Як жыта,
          раптам прараслі.

Нібы жывой вады напіўся,
Калі да сонца ў вышыню
Рвануліся твае снапы ўсе
З вясёлак,
          з музыкі,
          з агню,

Калі над залатым Самсонам
Ускінуўся вясёлы шум
І ўжо ніякім парасонам
Ад пырскаў не закрыць душу,
Калі,
          як арфы пераборы,
Скаціўся ўніз крыштальны гром
І промні,
          нібы мушкецёры,
Прайшлі праз кроплі напралом,

Калі пялёсткі пены белай
Чаромхай падалі да ног
І ўсё спявала і кіпела,
А я нагледзецца не мог...

Струмені срэбнымі снапамі
Ляцелі звонка на пясок...
Даруй,
          я ўзяў тады на памяць
З тваіх фантанаў каласок.

АЛЕГУ ШАСЦІНСКАМУ

Знаеш, Алег,
Толькі вочы заплюшчу —
Бачу скаваную лёдам Фантанку,
Высокі сумёт,
          завіруху сляпучую
І хлапчука згаладнелага з санкамі.

Шалік сястрын над плячом
          целяпаецца,
Вісне бацькоўскі шынель
          падкарочаны.
Мёртваю хваткай сашчэплены пальцы
На задубелай жалезнай вяроўчыне.

Ступіць тры крокі —
          знясілена падае,

Туліць,
Нібы птушанят,
Да грудзей
Чайнік вады,
Пайку хлеба блакаднага,
Заледзянелы агарак надзей.

Як за жыццё,
за вяроўку трымаецца,
Адчайна грабецца пад снегам і ветрам...
Каго ён ратуе —
Хворую маці,
Ці Ленінград,
Ці зняверaны свет наш?

Знаеш, Алег,
Калі розныя гады
Нам пагражаюць з нянавісцю воўчаю,
Мне ўспамінаецца хлопчык блакадны
І задубелая ў пальцах вяроўчына.

Столькі дуброў жалудамі адгрукалі!
Па-веснавому Фантанка плюскоча...
Але ўсё цягнуцца, цягнуцца рукі
Дапамагчы згаладнеламу хлопчыку.

Покуль па свеце праносяцца танкі,
Покуль над снамі вісяць самалёты,
Ён усё цягне знясілена санкі
Праз завіруху, па стылых сумётах...

* * *

У гаях лапоча лісце,
Што да восені — нядоўга.
Я ж спяшаюся кудысьці
Разам з новаю дарогай.

Не хаваю дні ў прыполе —
Рассяваю поўнай жменяй.
Што ні дзень — жыцця ўсё болей,
Што ні дзень — жыцця ўсё меней.

А на сэрцы, як ні дзіўна,
Ні хмурынкі шкадавання,
Што ўжо столькі адхадзіў я,
Столькі вытаптаў дазвання.

Толькі сум нахлыне часам,
Варухне душу трывога,
Што вяртаюся нячаста
Да бацькоўскага парога.

Я іду на кліч ласіны,
Да бароў смалістых еду.
І за мною — сіне-сіне:
Васількамі дні па следу...

АСЕННІЯ ГРЫБЫ

Спяць асеннія грыбы —
Лесу ціхія рабы —
І ва ўсіх адна надзея:
З лесу выбрацца абы.

Ледзь пачуюць рып які —
Ім здаецца:
грыбнікі
Прадзіраюцца рашуча
Да палян праз хмызнякі.

Як тады ахвота — ох! —
З капялюха скінуць мох,
Каб грыбнік яшчэ здалёку
Зачапіцца вокам мог,

Каб не бег за тры вярсты
У глухі гушчар густы
І не верыў нагаворам,
Што асенні лес пусты.

Нож хай будзе не тупы,
Кош хай будзе не скупы —
Сыраежак і зялёнак
На паляне тры капы.

А як толькі верасы
Паабсохнуць ад расы,
Падрашэтнікі палезуць —
Не адужаць без касы...

Крочыш з лесу, як герой.
У кашы — грыбы гарой...
Ох, і шчодры лес асенняй
Развітальнаю парой!

* * *

У твар дыхнула водарам вясны.
І адурманіў сіні хмель лясны.
І ўбок —
          усё няпэўнае на свеце.
Убок —
          зімовы халадок трывог.
Ля самых губ —
          бярозавае веццe,
І кветка-сон —
          каля стамлёных ног.

І звоніць, звоніць над палянай голай,
Аж песняй захлынаецца, жаўрук...
Ускінь насустрач гэтай песні голаў,
Ускінь насустрач сонцу промні рук,
Смакуй, як найсвяцейшае прычасце,
Гаркавы вецер, цёплы дух лясны...

Што ні кажыце,
          ёсць на свеце шчасце,
Пакуль дурманіць сіні хмель вясны.

* * *

Мы дома песень менш знаходзім,
Удалеч шлях кіруем свой.
На поўнач едзем
І на поўдзень,
Бліжэй да кедраў і секвой.

А там,
          дзе першы крок рабілі,
Дзе нашы мацеркі жывуць,
Растуць бярозы і рабіны
І лісце падае ў траву.

Ды мы
          наіўна прывыкаем,
Што нам спатрэбіцца пасля
Прашытая баравікамі,
Смалой прапахлая зямля.

Шукаем сцежак невядомых,
Чужыя топчам бальшакі.
А песні нас чакаюць дома,
Ля цёплай матчынай шчакі.

ЦІХІ ВЕРШ

Ціхая засень старэнькай альтанкі.
Ціхае шчасце —
Шэпат каханкі.

Ціхія гукі.
Цёплыя рукі.

Лісця чаромхі вячэрняя споведзь.
Вусны дыханне спалохана ловяць.
Сіняя ціша
Зоркі калыша.
Крылаў птушыных апошнія ўзмахі
Святло патушылі шэрыя гмахі.
Чуеш,
Як б'ецца
Сэрца ля сэрца?..

* * *

Не знаю,
          гэта добра ці нядобра,
Ды што хаваць мінулыя грахі —
І мне таксама міні даспадобы,
Хоць я ім запазніўся ў жаніхі.

Зноў прымушае здзіўлена спыніцца
Жаночы цуд,
          як гэты свет, стары.
У цесным калчане міні-спадніцы
Дзве юныя нагі — як дзве стралы.

І плёткі — міма.
Забабоны — міма.
І цокаюць па сонным сэрцы лодачкі.
І мілая дзяўчына ў моднай міні —
Як чарачка крыштальная на сподачку.

І чырванеюць посныя персоны.
І адарваць вачэй не можа Бог
Ад лёгкага,
          як хмарка,
          парасону
Над грэшнай парай загарэлых ног.

Пад пошласць — міны,
Пад святошасць — міны.

Аж крэкча цынік качкаю падсаднаю.
А стройныя дзяўчаты ў смелых міні —
Як строгія цюльпаны ў палісадніку.

І цёплы вецер ім каленкі мые.
І я без шкадавання і трывог
Гляджу,
як небу адкрываюць міні
Зямную прыгажосць дзявочых ног.

СПРОБА ВЯСЁЛАЙ ПЕСЕНЬКІ ПРА НЕТЫПОВЫХ ТУРЫСТАЎ

Хто за дзвесце кіламетраў,
Хто за трыста,
Хто з гітарай,
Хто з транзістарам,
Хто без —
На прыроду
Выпраўляюцца турысты.
Сцеражыся і дрыжы,
Шаноўны лес!

Колькі хуткасці,
Напору,
Весялосці —
Наваколле
Будзе войкаць і грымець!
Не трапляйся пад руку,
Вавёрка,
Лось
Ці
Ад маліны палагоднелы
Мядзведзь!

На траву ляцяць
Бляшанкі,
Шклянкі,
Пляшкі —
Кожны вольны і рашучы,

Што казак.
Распаўзайцеся,
Няўцямныя мурашкі, —
Homo sapiens
Развязвае рукзак.
Аглушыў паляну
Стук сякеры звонкі.
Ліжа полымя
Галіны і камлі...
Разбягайцеся,
Бярозкі і сасонкі!
Што ж вы, родныя,
Да долу прыраслі?

Салавей,
Канчай свае старыя оды —
Гэта ўсё
Для недасведчанай душы.
Першакласныя дыёды і трыёды
Шэйкам здолеюць
Пярнатых заглушыць.

Ля палатак
Дагарае корч смалісты.
Змоўк транзістар —
Батарэйкі падвялі...
Засынаюць
Асавелыя турысты.
Не будзі!
Хай будзе ціха на зямлі!

САБАКАРЫ

Братамі мне —
усе жывыя.
Люблю ласёў,
люблю баброў.
Але здаецца,
што завыю
Ад гарадскіх сабакароў,
Калі дзябёлыя кабеты
І дзецюкоў джынсовых рацць
Вязуць,
вядуць,
нясуць, як дзетак,
Сабак і сучак «прагуляць».

Ім трэба свежае паветра,
Вячэрні сцішаны прастор.
Ступаюць колі,
нібы мэтры,
Ідзе насуплены баксёр.

Імчаць настырныя аўчаркі.
Сапе раскормлены бульдог.
Як вераб'і ў зімовым парку,
Балонкі ціснуцца да ног...

А побач
юныя бароды
Размовы тонкія вядуць

Не пра прыроду —
pra народу,
Пра чуйны нюх
і лёгкі дух.

Любуюцца з замілаваннем
І з веданнем —
што ні кажы, —
Як іхні псюк ля дрэва стане
Ці хвост памацае чужы...

Тады ваўком завыць гатовы
Я між разбэшчаных звяроў...
Не пра сабак я —
што вы,
што вы!
Мой гнеў —
супроць гаспадароў.

Я б зразумеў іх,
каб не ведаў,
Што з радаслоўнаю шчанюк
Для іх мілей,
чым сын суседаў
Ці нават родны свой унук.

Я б паважаў іх,
каб не бачыў,
Што ім дайсці няма калі
Ад клопатаў пра лес сабачы
Да клопатаў пра лес зямлі...

Спяшаюць галубы схавацца.
Малеча тоіцца ў двары,
Калі клыкастых гадаванцаў
Выводзяць зноў сабакары.

У пальцах —
павадкі вужамі.
На пальцах —
ваўкадаваў шчэць.
І самі ўжо не заўважаюць,
Як пачынаюць сабачэць...

КАНАДСКІ ХАКЕЙ

Да д'ябла тэлевізары!
З білетамі — о'кей! —
Нібы з замежнай візаю,
Імчацца на хакей
Цырульнікі,
            правізары,
Начальнікі з падлізамі,
Свяшчэннікі пад рызамі,
Дызайнер
            і жакей.

Нібы ў бляшанцы шпроты
(«Падцісніце зады!»),
Яны ў Палацы спорту
Рассованы ў рады.
І над паветрам спёртым,
Над перагарам з потым
Запаленай употай
Паплыў цыгаркі дым...

Да д'ябла ўсе тэатры!
Схавайся ў цень, футбол!
Выходзяць гладыятары —
Ільбы як на падбор.
А гул,
            як лава ў кратэры,
Азартам сэрца кратае,
Давайце ж, чэрці клятыя,
Бой!

Нібы сцюдзёнкі шайку,
Уніз лінула столь —
Ахрыпла:
— Шайбу!
            Шайбу! —
Крычаць у глотак сто
Балельшчыцкія роты
З лавушкамі ратоў...
А шайба —
            за варотамі,
А шайба —
            ля бартоў.
Трэнер сваіх пад'юшвае,
Чужым праклёны шле.
І ўжо трашчыць пад клюшкаю,
Як шалупіна, шлем.
І ўжо кагосьці
            з лёту
Падмялі старчака
І паднімаюць з лёду,
Як мерцвяка.

Правілаў ляйчына
Аслабла ўшчэнт.
З тупасцю бычынай
Ігрок суддзю таўчэ.
А зала вар'яцее,
Люцее ад крыві,

Са смакам і надзеяй
Заходзіцца:
— Даві!
Дзяцюк з вачмі рачынымі,
Вусаценькі лаўчыла,
Лыткастая дзяўчына
Упрошваюць:
— Яшчэ!

Саромеецца чына
Генерал,
але ж
Шэпча:
— Малайчына!
Добра б'еш!..

О Божа мой, о Божа!
Няўжо ўсё гэта — спорт?!.
Няўжо ўсё гэта можна —
Галавою ў борт?..
Ніхто не дапаможа,
Калі пад клюшкай рожа,
Як пад нажом — апорт...
О Божа мой, о Божа!
Няўжо ўсё гэта — спорт?!.

* * *

Шпак спявае...
Стамлёныя крылы — ўразлёт,
Ад зямнога,
вясновага шчасця
зажмураны вочы.
Доўга песню хаваў ён за морам
ад сцюжы і слот —
І яна ў цёплай дзюбе цяпер і звініць, і булькоча.
Падлятае,
трымціць —
не сядзіцца шпаку.
Быццам
недзе хапіў непатухлага жару
І збіраецца
з клейкіх пупышак
на кожным суку
Распаліць
сто маленькіх
зялёных пажараў...

* * *

Я не га́ню землі чужыя —
Хай іх сонца не абміне.
Толькі дзе за морам ні жыў я,
Беларусь мая снілася мне.

Так карцела — сляза закіпала, —
Каб да сэрца хаця б здалёк
Прыплывалі жалейка Купалы,
Багдановічаў васілёк...

Гэта ўсё, безумоўна, не нова.
А ці трэба, каб новым было
Поле бацькава, матчына мова
І над хатай буслова жытло?

Хіба душы свае не лечым
Ад бяздомных бядот і згрызот
Самым простым і самым вечным,
Што пранёс праз вякі народ?

І якія б шляхі не схадзіў я,
Кліча полацкая сенажаць...
А калі не спяваць аб Радзіме,
Дык навошта наогул спяваць?

ПІСЬМО ПЯТРУ КЛІМУКУ З ЗАСНЕЖАНАЙ КАМАРОЎКІ

Панасыпала сёння сумётаў,
Аж схаваліся яблынь камлі —
Быццам сотня тваіх самалётаў
Пракаціла віхор па зямлі,
Быццам хмарай пранесліся гусі —
Кожны скінуў на вёску пяро...
Слава, гонар, любоў Беларусі,
Прыязджай на радзіму, Пятро.

Гэта можна ўявіць толькі дома —
Як заснулі ў палях маразы,
Як звіняць заінелыя бомы
І пад сонцам блішчаць палазы,
Як на белым бяскрайнім абрусе
Зіхаціць завірух серабро. .
Слава, гонар, любоў Беларусі,
Прыязджай на радзіму, Пятро.

Хай дымы рассцілае сталіца
Неадмытай старой прасцінай.
Я з табою хачу падзяліцца
Першабытнай зямной чысцінёй,
На прасторы, расчыненым насцеж,
Цёплым промням падставіць шчаку
І рыпучую сцежку пракласці
Па сляпучым глухім цаліку,
Каб сіберныя ветры атрэслі

Сум настылы з кашлатых хваін
І касмічныя трасы і стрэсы
Ты забыў хоць на дзесяць хвілін…

Не паддайся сумненню і скрусе,
Не прыхоўвай у сэрцы дабро —
Слава, гонар, любоў Беларусі,
Прыязджай на радзіму, Пятро!

НЕКАЛЬКІ ЖАРТАЎЛІВЫХ ДЫЯЛОГАЎ

З СОНЦАМ

Вечар па небе едзе
На аднаколавым веласіпедзе.
Тармозіць —
і затухае
Бліскание чырвоных спіц.
Сонца за цёмныя сосны
Скацілася недзе.
Спіць.

Як там яму — у Амерыцы?
Не горача?
Не мулка?
Усё-такі Амерыка —
Не наша старана.
Там і каровы, напэўна,
Па-іншаму мукаюць,
І капіталісты стаяць ля стырна…

І пайшоў я да сонца ў Амерыку.
Пералез праз хрыбет Урала.
Праз Енісей пераскочыў.
Прадзёрся праз зялёнае шчаціннe тайгі.
І прыйшоў.
А сонца не спала.
І злосць мяне разабрала:
Што гэта за беспрынцыпнасць —

Свяціць і тым, і другім?

Такая непераборлівасць
Са здрадаю нават мяжуе.
Вось вам і ўсёдаравальнасць,
І прымірэнчасць сама:
Уранні — грэе рабочага,
Увечары — грэе буржуя.
А кажуць яшчэ,
Што на сонцы плямаў няма.

Сонца глядзіць спакойна.
Не спрачаецца і не сварыцца.
І кажа:
— Не кіпяціся.
Хто можа мяне самалётам дагнаць?
Хто мікраклімат мае?
Хто грэецца кварцам?
Знаць.

А хто ў жоўтай Афрыцы
І ў блакітнай Грэцыі
Майму кожнаму промню,
Як выратаванню, рад,
Каб пасля галоднага вечара,
Пасля начы беспрытульнай сагрэцца?
Пралетарыят.

Ніхто без мяне —
Ні Бог, ні міласэрная пані —
Не запаліць жабраку
Надзеі тонкую стэарынаваю свячу.
Вось і кручуся,
Чырвонае ад недасыпання.
Уранні — тут,
Увечары — там
Свячу.

Ты, чалавек,
Сам наводзь на зямлі справядлівасць.
Майго ж старога парадку —
Не руш...

...І я пакланіўся нізка.
І пачырванеў сарамліва.
І зняў капялюш.

З МУРАШОМ

З вялізнай жоўтай саломінай —
Падгіналіся ногі аж —
Поўз па галінцы зломленай
Лупаты, лабаты мураш.

Спыніўся, каб дых перавесці.
І я падышоў да яго.
— Слухай, — кажу, — урэшце
Рвешся ты так чаго?

Ты ж ад работы чорны.
Аддыхайся, не спяшы.
Праўду пішуць вучоныя —
Дзіўныя вы, мурашы...

Ён сеў ля саломіны чынна —
Пот блішчыць на ілбе:
— Вам памагаюць машыны.
А мы ж усё — на сабе.

У вас і лазер, і атам,
І краны, і трактары.
А ў нас —
Шэсць лап слабаватых
Ды цёплае сонца ўгары.

У нас трэба ўсё самому.
На ўласным сваім плячы
Колькі цяжкіх саломін
Трэба прывалакчы!

Выспацца нават некалі:
Лёг, а ўжо трэба ўставаць...
Паслухай,
Будзь чалавекам —
Не перашкаджай працаваць!..

З ТРУТНЕМ

На пасецы ўсё ад звону гуло.
Стаяў гармідар вясёлы.
То мчаліся ў ранішні луг за сяло,
То назад вярталіся пчолы.

Стамлёна спускаліся да латака,
З ног абтрасалі ўзяткі.
Як хмарка, крылатая талака
Мільгала ля кожнай хаткі.

Пачаўся летні духмяны дзень,
Сонечны,
          доўгі,
          трудны.
А за калодай, дзе шэры цень,
Ляжалі сонныя трутні.

Адзін пазяхнуў,
          пачасаў спіну,
Выпрастаўся з асалодай
І мне па-змоўніцку падміргнуў:
— Глынуць бы вады халоднай!

— А як жа пчолы?
          За рэйсам рэйс
Шнуруюць на луг далёкі...
— Дурныя!
Маглі б пачакаць, падурэць,

Налёталіся б пасля спёкі.

Што, іх гоніць нехта ў каршэнь?
Ты расшчапі калоду —
Хопіць усім нам на цэлы дзень.
Там жа, як лёду, мёду.

Не могуць гадзіны адной пасядзець,
Лепяць і лепяць соты.
А што, як раптам прыйдзе мядзведзь
Бывай цэлы месяц работы!

Восенню выграбе мёд чалавек —
Паўгода штодзённай працы,
Цукру падсуне ім —
жруць
і павек
Не могуць ні ў чым разабрацца.

Да самага вечара будуць звінець,
Не вылузнуць ледзьве са скуры...
А я не працую.
Затое мяне
Ніколі ніхто не абдурыць...

Я ўжо нахіліўся яго раздушыць.
Ды раптам рука задрыжала:
У трутня ж напагатове заўжды
Доўгае вострае джала.

Ягоны балючы, пякучы агонь
На дзень мне жыццё атруціць...

...І зарагатаў ён мне наўздагон —
Вялізны калматы труцень:
«А ў мяне ж джала няма!»

СНЕЖНАЯ ІМПРЭСІЯ

Ты куды мяне клічаш,
паслухай? —
На дварэ ні машын, ні людзей.
Завіруха мяце, завіруха...
Белы снег,
Белы цень,
Белы дзень.

Я іду за табой,
як сляпая,
Патрапляю ў замецены след.
Засыпае нас снег, засыпае.
Белы снег,
Белы след,
Белы свет.

Як паходня,
твой шаль ружавее.
І вакол —
ні вачэй, ні акон.

На зямлі —
я і ты
і завея,
Белы снег,
Белы клён,
Белы сон...

ЛІСТОК АЛЬБОМА З XIX СТАГОДДЗЯ

«У шляхетным палацы,
У аздобленай мармурам зале,
Дзе грымела мазурка
І свечкі гарэлі ледзь-ледзь,
Перад дамамі сэрца
Паэты калені схілялі —
І жанчыны шчасліва
Пачыналі ўміг маладзець.

Гнеўны верш, як пальчатку,
Кідалі збялелым тыранам,
Ад сябе лёгкім жэстам
Адвёўшы знямелую смерць.
На світанні паэты
Прыносілі кветкі каханым —
І жанчыны шчасліва
Абяцалі ім век не старэць.

З-пад чужых небасхілаў,
Дзе крыж свой пакутніцкі неслі,
Дзе ў душы дагаралі
Летуценні былыя і злосць,
Прысылалі паэты сяброўкам
Лебядзіныя песні —
І жанчыны шчасліва
Берaглі праз гады маладосць.

І няхай у высокіх палацах

Пацямнеюць паркеты
І прыглухне мазуркі
Шляхетная медзь —
Пакуль будуць жанчыны,
Не замоўкнуць паэты,
Пакуль будуць паэты,
Жанчыны не будуць старэць...»

РАЗВІТАННЕ З ВЕРАНІКАЙ

Максіму Багдановічу

Ён нахіліўся над сталом
Пралескай позняю паніклай,
Самота стыне над чалом,
А вусны трызняць Веранікай.

Яна, як месяца святло,
Яму ўжо не сагрэе грудзі.
Такой, як сніў ён, не было.
Такой ніколі ўжо не будзе.

Пагасне месяц у акне,
А зоркі скоцяцца слязамі.
І смерць бязлітасна ўзмахне
Сваімі чорнымі крыламі.

Навек зламаецца вясло
На пеннай хвалі ў сіняй бухце.
Вачэй Максімавых святло
Трывожыць больш яе не будзе...

Што ж, паўглядаліся здалёк
І моўчкі разышліся жыцці...
А ўсё сінее васілёк
У спелым беларускім жыце...

* * *

Бег да цябе праз буран і імжу,
Поўз да цябе з летуценнем і скрухай
Болей маўчаць не магу.
Я скажу.
Ты мяне ўважліва толькі паслухай.

Вуснамі смелыя словы ляплю,
Цяжка і горача іх выдыхаю:
Чуеш, каханая? — верна люблю,
Чуеш, любімая? — шчыра кахаю.

Можаш пасля адмахнуцца —
«Бывай
Можаш пасля адвярнуцца сурова.
Толькі даслухай, не перабівай.
Як мне баліць мае кожнае слова!

Вуснамі смяглыя вусны лаўлю
І перад вечнаю тайнай сціхаю...
Чуеш, каханая, — верна люблю,
Чуеш, любімая, — шчыра кахаю...

* * *

Імклівы час — мудрэц вялікі.
Як паяднаў чароўна ён
Каханых незямныя лікі,
Зямныя воблікі мадонн!

Як звёў іх проста і прароча,
Злучыў развагу і парыў,
На прыгажосць жывую вочы
Велікадушна нам адкрыў!

І абнавілася каханне,
І ў разняволенай душы
Зямлі і неба паяднанне
Даспела, нібы спарышы.

І ў снах пакутлівых узніклі,
Неразгаданыя спакон,
Каханых незямныя лікі,
Зямныя воблікі мадонн...

* * *

Сябе да адзіноты прывучаю,
А шэпт твой горкі ўсё па сэрцы б'е,
Як жураўліны кліч,
Як крык адчаю:
«Я так засумавала без цябе!»

Навошта — зноў?
Усё даўно забыта,
Закрэслена маршчынкай на ілбе,
Я нашых сцежак болей не разблытваў
Рассек
і за сябе, і за цябе.

Ды толькі над разлівам іван-чаю,
Над палыном ссівелым
у журбе,
Як жураўліны кліч,
Як кліч адчаю,
Плыве:
«Я так сумую без цябе!»

* * *

Ты спытала,
што вазьму я
У дарогу ў снег і слоту,
Калі вельмі засумую.
Адказаў:
— Тваю пяшчоту.

Ты пытала ў задуменні,
Што важней за ўсё —
Работа,
Шчасце,
Поспехі,
Натхненне?
Я шаптаў:
— Твая пяшчота.

Без падказкі і прымусу
У адчаі і самоце
Давяраю і малюся
Толькі ёй —
Тваёй пяшчоце.

І калі б ты запытала
У дзесяты раз і ў соты,
А чаго ў жыцці мне мала,
Я б сказаў:
— Тваёй пяшчоты...

* * *

Я за жыццё сваё спасціг,
Што злосць —
          сястра зларадпасці,
А сэрца,
          што ў грудзях маіх, —
Гняздо
          для птушкі радасці.

Ды толькі вось адно бяда,
Якую не агораю,
Не прылятае да гнязда
Пяюння яснапёрая.

Затое ў дождж і ў халады
Ляцяць,
          прытулку просячы,
Другія птушкі —
          з чарады
Сумнення,
Смутку,
Роспачы.

Як найбліжэйшая з прынад,
Так вабіць іх
          гняздо мае.
Хіба ж я мог іх не прыняць,
Калі яны
          бяздомныя?

Яны ў мяне ў гасцях жылі
У зацішку спагаднасці,
Каб гнёзды іншыя былі
Сагрэты птушкай радасці.

Я і цяпер іх галасы
Лаўлю душою шчыраю
І веру:
          блізяцца часы,
Што клікнуць іх да выраю.

І будзе свет —
          як светлы дом,
Без подласці і зайздрасці.
І я аддам яму гняздо
Для звонкай птушкі радасці.

Няхай яна
          усім пяе,
Шчабеча,
          не змаўкае ўсё.
Я дачакаюся яе.
Дачакаюся...

ВЫТОК

Што
радасці маёй выток,
Выток натхнення і гарэння? —
З крыніцы полацкай глыток,
З лясоў, з-пад самага карэння,
Ці зорных караблёў віток
Над светам, поўным захаплення,
Ці ленінскіх сцягоў паток
Пад майскім ветрам абнаўлення?..
Гады прыспешваюць — і мы
Задумваемся пра вытокі,
І ясна бачым праз дымы
Чырвонай гвардыі вінтоўкі
І партызанскія ватоўкі,
І добра ўсведамляем мы,
Чые — сыны, чые — патомкі,
Чыёй нянавісці абломкі
Усыпалі наш шлях прамы...
І гонару майго выток,
Выток памкнення і натхнення —
З крыніцы полацкай глыток,
І зорных караблёў віток,
І ленінскіх сцягоў паток
Пад майскім ветрам абнаўлення.
Пяю, як трапяткі лісток
На дрэве вернасці высокім.
І хочацца, каб мой радок
Стаў нейчай радасці вытокам...

* * *

Народ мой,
дзякую табе,
Што і на міг мне не дазволіў,
Каб я кагосьці абязволіў,
Жыў у кагосьці на гарбе,
Што ў радаслоўную ўпісаў
Не гандляроў і прайдзісветаў,
А плытагонаў і паэтаў,
І штукароў ганчарных спраў.

Народ мой,
дзякую, што ты
Велікадушна даў мне ў рукі
Не алебарды і шчыты,
А лемяхі і першадрукі,
Што нашаптаць мне не забыў
Не грукатню бравурных маршаў,
А задуменнасць песень нашых,
Дзе столькі болю і жальбы.
Народ мой, дзякуй, што нідзе
Мяне балюча не ўпікнулі
За твой далёкі век мінулы,
За сённяшні твой сіні дзень.
І аднаго хачу ў жыцці,
Каб ты не паглядзеў з дакорам,
Каб за мяне ніколі сорам
Табе душу не засмуціў.

ЗМЕСТ

Геннадий Николаевич Буравкин

СИНИЕ КАЧЕЛИ
Стихи
Для старшего школьного возраста
Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке
Загадчык рэдакцыі В. М. Новік
Рэдактар У. Б. Ідэльсон
Малодшы рэдактар Г. Д. Зінчанка
Мастак Б. П. Масцераў
Мастацкі рэдактар В. І. Кліменка
Тэхнічны рэдактар В. А. Каляда
Карэктар А. К. Юшына
ІБ № 862
Здадзена ў набор 08.08.86. Падпісапа да друку 08.05.87. АТ 05080.
Фармат 70Х90 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 4,68. Ум. фарб.-адб. 4,68. Ул.-выд. арк. 4,23. Тыраж 8000 экз. Зак. 2719. Цана 60 к.
Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат
МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Бураўкін Г.

Сінія арэлі: Вершы: Для ст. шк. узросту.— Мн.: Юнацтва, 1987.— 124 с.

У кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Генадзя Бураўкіна ўвайшлі творы аб камсамольскім юнацтве. адданасці рэвалюцыйным ідэалам, аб светлым пачуцці кахання.